Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
_______________В. Р. Языковіч
«___» _______________2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД - _____ / вуч.

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ З АРКЕСТРАМ І АНСАМБЛЕМ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02*
*Народная творчасць (інструментальная музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная*
*музыка духавая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 – 2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці. Рэгістрацыйны нумар С 18-1-112/19 вуч.


**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт



**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;
*В. В. Старыкава,* дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 18.04.2019);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 12.06.2019)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» з'яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для музычнага мастацтва, у тым ліку яго разнастайнасці – духавога мастацтва. Вывучэнне мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей духавых і ўдарных аркестравых інструментаў на лепшых узорах музычнага мастацтва спрыяе фарміраванню ў студэнтаў разглядаемай спецыяльнасці дакладных ведаў аб функцыянаванні гэтых мастацкіх калектываў у сучаснай мастацкай культуры.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**Інавацыйна-метадычная дзейнасць**

ПК-20. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы.

ПК-21. Удасканальваць методыкі работы з творчымі калектывамі, распрацоўваць вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру па методыцы работы з аркестрам і ансамблем.

ПК-22. Арганізоўваць работу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах развіцця народнай творчасці ў сферы духавой аркестравай ці ансамблевай музыкі.

**Творчая дзейнасць**

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пералажэнні для калектыву аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму для розных складаў аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў.

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні калектываў аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

Падчас заняткаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» адпаведна сваёй будучай прафесіі студэнты набываюць практыку састаўлення плана работы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рознымі складамі ансамбляў (аднайменны, роднасны, змешаны) ці аркестраў духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Гісторыя мастацтваў», «Тэорыя музыкі», «Інструментазнаўства і інструментоўка», «Аркестравае выканальніцтва», «Ансамблевае выканальніцтва», «Аркестрава-ансамблевая падрыхтоўка», «Аркестравая і ансамблевая літаратура», «Гісторыя, тэорыя дырыжорскага аркестравага выканальніцтва», «Дырыжыраванне», «Гісторыя і тэорыя выканальніцтва на духавых і ўдарных інструментах», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Чытанне аркестравых партытур».

***Мэта вучэбнай дысцыпліны*** – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны ажыццяўляць творча-выканальніцкую дзейнасць у адпаведнасці з тым складам аркестра ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць (тыпавыя, а таксама эксперыментальныя склады аркестраў, ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў).

***Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны*** – атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў па методыцы работы з аркестрам ці ансамблем духавых і ўдарных інструментаў, тыпалогіі гэтых калектываў, развіццё асабістых навыкаў па састаўленні плана работы з аматарскім мастацкім калектывам у галіне духавога мастацтва, якая ўключае наступныя пытанні:

– падбіранне партытур для розных складаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў з мэтай эфектыўнай арганізацыі рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– дакладнае афармленне зместу розных планаў работы з аматарскім калектывам (ансамбль, аркестр);

– дакладныя веды і сутнасць розных тыпаў агульнакалектыўных рэпетыцый з аматарскім калектывам (ансамбль, аркестр);

– аптымальнае вызначэнне партытур для розных складаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі арганізацыі сацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай, музычна-асветніцкай і музычна-эстэтычнай дзейнасці аматарскага калектыву (ансамбль, аркестр);

– расшыфроўкі існуючай спецыяльнай тэрміналогіі па методыцы работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавых складаў ансамбляў ці аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– сутнасць аркестрава-ансамблевага выканальніцтва і вызначэнне адпаведных задач пры выкананні музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па напісанні партытур для ансамбляў ці аркестраў духавых інструментаў;

– этапы работы над музычнымі творамі, іх змест і задачы;

– выкананне музычных твораў розных тэматычных груп падчас працэсу фарміравання рэпертуару для аматарскіх калектываў духавых і ўдарных музычных інструментаў (ансамбль, аркестр);

– функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці духавых і ўдарных інструментаў і спецыфіку іх выкарыстання ў ансамблі ці аркестры розных складаў;

– сутнасць аркестрава-ансамблевай падрыхтоўкі падчас арганізацыі агульнааркестравай рэпетыцыі;

– сацыякультурныя аспекты, асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў і выкарыстанне разнастайнасці мастацка-тэматычных груп музычных твораў з улікам сацыяльнай і ўзроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма;

*умець*:

– складаць план работы з вызначаным складам аматарскага аркестра ці ансамбля духавых і ўдарных інструментаў;

– вызначаць тыпы рэпетыцыйных заняткаў для розных складаў аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– вызначаць тыпы рэпетыцыйных заняткаў для ансамбля, аркестравых груп у межах аркестравага калектыву;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вырашаць пытанні па выкананні аркестравых (ансамблевых) цяжкасцей для ўдзельнікаў той ці іншай інструментальнай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнага матэрыялу;

– ажыццяўляць аналітычную работу падчас вызначэння партытур для падрыхтоўкі музычных твораў;

– ажыццяўляць практычную работу падчас вызначэння партытур і правядзення рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (вызначэнне асобных фрагментаў меладычнага голасавядзення, кантрапункта, умова адпаведнага транспанавання і неабходнай змены тэсітуры гучання музычнага твора, улік жанрава-стылявых асаблівасцей пры выкананні ансамблем ці аркестрам духавых і ўдарных інструментаў і г. д.);

*валодаць*:

– асноўнай тэрміналогіяй сферы духавога мастацтва, якая тычыцца творча-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– прыёмамі работы з аўтэнтычнымі, жанрава-стылявымі і аўтарскімі сучаснымі музычнымі творамі для выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах;

– навыкамі пошуку ў розных фондах музычных твораў, якія неабходна інструментаваць для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– спецыфікай выкарыстання эпізадычных музычных інструментаў у складзе сучасных ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– вызначэннем адпаведнага інтэрвалу транспазіцыі для духавых і ўдарных інструментаў, якія транспануюць;

– тэхнікай чытання партытур музычных твораў і аналізам складу ансамбля, аркестра, іх груп ці асобных інструментаў у сучасных калектывах духавога мастацтва.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» прадугледжана 108 гадзін, з якіх 48 гадзін – аўдыторныя (40 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – семінарскія) заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем». Сувязь і ўзаемаабумоўленасць з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі:

1) музычна-тэарэтычныя вучэбныя дысцыпліны: «Гісторыя мастацтваў», «Тэорыя музыкі» з улікам засваення ведаў па гармоніі, поліфаніі, аналізе музычных форм;

2) спецыяльныя вучэбныя дысцыпліны: «Інструментазнаўства і інструментоўка», «Аркестравае выканальніцтва», «Жанрава-стылявыя асаблівасці аркестравага выканальніцтва», «Ансамблевае выканальніцтва», «Аркестрава-ансамблевая падрыхтоўка», «Аркестравая і ансамблевая літаратура», «Гісторыя, тэорыя дырыжорскага аркестравага выканальніцтва», «Дырыжыраванне», «Гісторыя і тэорыя выканальніцтва на духавых і ўдарных інструментах», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Чытанне аркестравых партытур» і г. д.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» як галіна спецыяльных музычна-тэарэтычных ведаў, практычна-творчых навыкаў і ўменняў будучых кіраўнікоў аматарскіх аркестраў і ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў.

Асноўныя задачы і змест вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем».

Асноўныя віды заняткаў, формы бягучага і выніковага кантролю ведаў.

Сутнасць тэрміна *методыка работы з аркестрам і ансамблем* і яго параўнальны аналіз з тэрмінам *методыка работы з музычным творам*. Вызначэнне зместу тэрміна *методыка работы з аркестрам і ансамблем*.

Месца вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» у падрыхтоўцы кіраўнікоў аркестраў (ансамбляў) на сучасным этапе развіцця нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры і духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. Гісторыя развіцця аматарскіх аркестраў, ансамбляў

### *Тэма 1. Гісторыя развіцця ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (у кантэксце беларускай і сусветнай музычнай культуры)*

Асаблівасці фарміравання ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у замежных краінах на першапачатковым этапе.

Асаблівасці фарміравання ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у Беларусі на першапачатковым этапе.

Перыядызацыя працэсу фарміравання ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у замежных краінах і яго этапы.

Перыядызацыя працэсу фарміравання ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у Беларусі і яго этапы.

### *Тэма 2. Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюцца ансамблі і аркестры духавых і ўдарных інструментаў.

Спецыфіка ўключэння ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выкананне; ансамблевае выкананне; аркестравае выкананне).

Сацыякультурныя асаблівасці сучаснай творчай дзейнасці ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

## Раздзел II. Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў

### *Тэма 3. Сутнасць прафесійнай дзейнасці кіраўнікоў аматарскіх ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Поліфункцыянальныя службовыя абавязкі кіраўніка аматарскага ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў па арганізацыі выхаваўчай і вучэбна-творчай работы аматарскага мастацкага калектыву. Кіраўнік аматарскага ансамбля і аркестра духавых інструментаў – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы аматарскага мастацкага калектыву.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэты, задачы і змест вучэбна-выхаваўчага працэсу ў аматарскім аркестры, ансамблі духавых і ўдарных інструментаў. Асноўныя кірункі і кампаненты вучэбна-выхаваўчага і творча-выканальніцкага працэсу аматарскага аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў. Мэты, задачы і формы музычна-тэарэтычнай падрыхтоўкі і эстэтычнага выхавання ў аматарскім аркестры, ансамблі духавых і ўдарных інструментаў.

Праблемы арганізацыі калектываў аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

## Раздзел III. Творча-практычныя аспекты методыкі работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў

### *Тэма 4. Работа па дакладным інтанаванні ў ансамблі, аркестры духавых і ўдарных інструментаў*

Асаблівасці інтанавання пры выкананні на духавых інструментах з улікам іх тыпалогіі, дынаміка-акустычных асаблівасцей (тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання).

Спецыфіка, асноўныя віды і сістэмы настройкі духавых інструментаў у складзе ансамбля, аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Спосабы настройкі з улікам арганалагічных і дынаміка-акустычных асаблівасцей духавых інструментаў. Карэкціроўка інтанацыі ў працэсе выканання той ці іншай паслядоўнасці інтэрвалаў і г. д.

Улік асаблівасцей і спосабаў карэкціроўкі інтанавання духавых інструментаў у працэсе сольнага ці сумеснага выканальніцтва.

Музычны гук і яго асаблівасці ўспрымання ў гучанні духавых і ўдарных музычных інструментаў. Асноўныя віды музычнага слыху.

Галоўныя састаўныя часткі духавых і ўдарных музычных інструментаў. Фактары, якія абумоўліваюць спецыфіку прыёмаў гуказдабывання на духавых інструментах.

### *Тэма 5. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з духавымі інструментамі, якія транспануюць*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасць тэрмінаў *транспазіцыя* і *транспанаванне*. Прынцып класіфікацыі транспануючых інструментаў (асаблівасці тэсітуры гучання). Паняцце *строй інструмента* і яго разнастайнасці. Асаблівасці натацыі інструментаў, якія транспануюць, у ансамблевых, аркестравых партытурах і партыях і спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

*Тэма 6. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай лабіяльных інструментаў*

Група лабіяльных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля ці аркестра духавых інструментаў. Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей лабіяльных духавых інструментаў (флейта-пікала, флейта-сапрана, флейта-альт, флейта-бас). Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

*Тэма 7. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай язычковых інструментаў*

Група язычковых інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны). Выкарыстанне язычковых інструментаў у аркестры духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей язычковых духавых інструментаў (габой, англійскі ражок, кларнет-пікала in Es, кларнет-сапрана in B, кларнет-сапрана in A, кларнет-бас in B; фагот). Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

*Тэма 8. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай саксафонаў*

Група саксафонаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне групы саксафонаў у аркестры духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей саксафонаў (саксафон-сапраніна in Es, саксафон-сапрана in B, саксафон-альт in Es саксафон-тэнар in B, саксафон-барытон in Es і інш.). Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

## *Тэма 9. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай характарных інструментаў*

Група характарных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамля (аднайменны, роднасны, змешаны). Выкарыстанне групы характарных інструментаў у аркестры духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы характарных духавых інструментаў (валтора in Es, валторна in F; труба in B; трамбон in B). Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

## *Тэма 10. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай ударных і эпізадычных інструментаў*

Група ўдарных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне групы ўдарных інструментаў у аркестры духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы ўдарных інструментаў.

Разнастайнасці эпізадычных інструментаў, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца ў ансамблях ці аркестрах духавых і ўдарных інструментаў. Натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей эпізадычных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай асноўных амбушурных медных духавых інструментаў*

Група асноўных амбушурных медных духавых інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны). Выкарыстанне групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў у аркестры духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў (карнет-сапраніна in Es, карнет-сапрана in B; альтгорн in Es, тэнар-горн in B, барытон-горн in B, эўфоніум in B, туба in Es, туба in B).

Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульнакалектыўных рэпетыцый.

*Тэма 12. Рэпетыцыйная работа з ансамблямі духавых і ўдарных інструментаў*

Асноўныя склады ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў (аднайменныя, роднасныя, змешаныя).

Функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці ансамбляў духавых, ударных інструментаў і іх выкарыстанне ў сучаснай выканальніцкай практыцы.

Размеркаванне выканаўцаў з улікам галасоў у аркестры духавых і ўдарных інструментаў.

Размеркаванне выканаўцаў з улікам галасоў у ансамблі духавых, духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 13. Рэпетыцыйная работа з аркестрамі духавых і ўдарных інструментаў*

Функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных складаў аркестраў духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны) і іх выкарыстанне ў сучаснай выканальніцкай практыцы.

Асаблівасці рэпетыцыйнай работы з асноўнымі складамі аркестраў духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Размеркаванне выканаўцаў з улікам галасоў у аркестры духавых і ўдарных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Асноўныя тыпы рэпетыцыйнай работы*

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці правядзення асноўных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Сутнасць правядзення і асаблівасці правядзення рэпетыцыйных заняткаў з ансамблямі духавых і ўдарных інструментаў (аднайменныя, роднасныя, змешаныя склады ансамблевых калектываў).

Сутнасць правядзення і змест ардынарнай рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Сутнасць правядзення і змест карэктурнай рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Сутнасць правядзення і змест прагоннай рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Сутнасць правядзення і змест генеральнай рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 15. Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці правядзення асноўных відаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (дывертысментныя, тэматычныя, монатэматычныя, юбілейныя і іншыя разнастайнасці канцэртных выступленняў).

Сацыякультурныя асаблівасці сучаснай творчай дзейнасці аматарскіх ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

Сучасныя формы дзейнасці аматарскіх ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Агульная колькасць гадзін | | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. | | |
| ***Уводзіны*** | 2 | | | |
| **Раздзел I. Гісторыя развіцця аматарскіх аркестраў, ансамбляў** | | | | |
| *Тэма 1.* Гісторыя развіцця ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (у кантэксце беларускай і сусветнай музычнай культуры) | 2 | | 1 | тэст |
| *Тэма 2.* Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | | 1 | тэст |
| **Раздзел II. Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў** | | | | |
| *Тэма 3.* Сутнасць прафесійнай дзейнасці кіраўнікоў аматарскіх ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | | 2 | франт. апытанне |
| **Раздзел III. Творча-практычныя аспекты методыкі работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў** | | | | |
| *Тэма 4.* Работа па дакладным інтанаванні ў ансамблі, аркестры духавых і ўдарных інструментаў | 2 | | 1 | франт. апытанне |
| *Тэма 5.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з духавымі інструментамі, якія транспануюць | 2 | | | |
| *Тэма 6.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай лабіяльных інструментаў | 2 | | | |
| *Тэма 7.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай язычковых інструментаў | 2 | | | |
| *Тэма 8.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай саксафонаў | 2 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 9.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай характарных інструментаў | 1 | | | |
| *Тэма 10.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай ударных і эпізадычных інструментаў | 1 | | | |
| *Тэма 11.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з групай асноўных амбушурных медных духавых інструментаў | 2 | | | |
| *Тэма 12.* Рэпетыцыйная работа з ансамблямі духавых і ўдарных інструментаў | 4 | 1 | | |
| *Тэма 13.* Рэпетыцыйная работа з аркестрамі духавых і ўдарных інструментаў | 6 | 1 | 1 | індыв. практыкаванні |
| *Тэма 14.* Асноўныя тыпы рэпетыцыйнай работы | 2 | 1 | 1 | індыв. практыкаванні |
| *Тэма 15.* Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 1 | 1 | індыв. практыкаванні |
| **Усяго…** | **36** | **4** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, з'яў, крытэрыяў і форм кантролю вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца музычна-педагагічнай кваліфікацыі і культуры выкладчыка ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення педагагічнага майстэрства ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці). Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля вучэбна-выхаваўчага працэсу па навучанні спецыфіцы музычнага мастацтва; сістэмы музычнай адукацыі па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах; веданне асноўных форм і метадаў засваення музычнага мастацтва ў розных тыпах вучэбных устаноў і г. д.).<br>Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дзейнасці фальклорных калектываў, падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, раскрыццё праблем музычнай адукацыі ў сучасных умовах развіцця культуры.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі кіраўнікоў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне асабістых вывадаў канткрэтнымі прыкладамі з вопыту работы лепшых кіраўнікоў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, выкладчыкаў у розных тыпах вучэбных устаноў.<br>Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па спецыяльных дысцыплінах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дзейнасці кіраўнікоў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Усведамленне студэнтам вучэбна-творчага і вучэбна-педагагічнага працэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў, асэнсаванне вопыту вядучых кіраўнікоў духавых мастацкіх калектываў, спецыялістаў-выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць формы і метады арганізацыі творчага вучэбна-выхаваўчага працэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, карыстацца вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі кіраўнікоў духавых мастацкіх калектываў, выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Глыбокае асэнсаванне праблем музычнага выхавання і навучання выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай, вытворчай, выканальніцкай дзейнасці кіраўнікоў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, аналізаваць праблемы, якія існуюць у практыцы навучальных устаноў. Кваліфікаванае карыстанне вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні, методыцы работы з ансамблем, аркестрам духавых і ўдарных інструментаў. Адсутнасць памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. *Амиров, А. И.* Самодеятельный духовой оркестр / А. И. Амиров. – Минск : Беларусь, 1990. – 72 с.

2. *Архангельский, И. П.* Организация духовых оркестров и обучение игре на духовых инструментах / И.П. Архангельский. – Минск: РНМЦ НТ и КПР, 1981. – 69 с.

3. *Гончарова, Н.* Работа над ансамблями как одна из форм развития интереса в обучении музыке детей со средними природными данными / Н. Гончарова // Музыкальная педагогика. – Ростов н /Д, 2009. – С. 91–100.

4. *Карацееў, А. Л.* Змест і практычная накіраванасць навучальна-творчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў (арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву) : навуч.-метад. дапам. / А. Л. Карацееў. – Мінск : МІК, 1993. – 17 с.

5. *Карацееў, А. Л.* Праблемы арганізацыі навучальна-творчага працэсу аматарскіх духавых, эстрадных аркестравых калектываў : навуч.-метад. дапам / А. Л. Карацееў // Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі. – Мінск, 1994. – С. 66–87.

6. *Карацееў, А. Л.* Шляхі фарміравання цэласнай сістэмы павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў / А. Л. Карацееў // Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў : тэзісы дакладаў Міжнар. навук.-метад. канф. (18–19 крас. 1993 г.). – Мінск, 1993. – Ч. 2. – С. 37–39.

7. *Коротеев, А. Л.* Активные формы обучения на занятиях по курсу «Методическое руководство самодеятельным оркестровым коллективом» (оркестр духовых инструментов) / А. Л. Коротеев // Использование активных методов обучения будущих специалистов в области культуры : сб. тезисов докладов на XI Итоговой науч.-метод. конф. профессорско-препод. состава. – Минск, 1990. – С. 22–55.

8. *Коротеев, А. Л.* Актуальные проблемы методики работы с ансамблями и оркестрами духовых и ударных инструментов

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(профессиональные и любительские коллективы) / А. Л. Коротеев // Оркестр. – № 1. – 2005. – С. 11–13.

*9. Коротеев, А. Л.* Методика работы с самодеятельным оркестровым коллективом : программа для ин-тов культуры и искусств по специальности (специализация «руководство самодеятельным духовым оркестром») / А. Л. Коротеев. – М. : Всесоюз. науч.-метод. кабинет по учебным заведениям искусств и культуры, 1991. – 26 с.

*10. Коротеев, А. Л.* Методика работы с самодеятельным оркестровым коллективом (духовой, эстрадный оркестр): метод. указания и тематический план лекционных, практических занятий / А. Л. Коротеев. – Минск : МИК, 1986. – 33 с.

*11. Коротеев, А. Л.* Основные направления учебно-воспитательной и творческой работы самодеятельного духового оркестра / А. Л. Коротеев // Вопр. культуры и искусства Белоруссии. – Минск, 1983. – Вып. 2. – С. 125–130.

*12. Коротеев, А. Л.* Учебно-воспитательный и творческий процессы в любительском оркестре духовых инструментов / А. Л. Коротеев // Вопр. теории и практики КПР: тезисы докладов на конф. профессорско-преподавательского состава (XII). – Минск, 1991. – С. 45–48.

*13. Крюкова, В.* Работа с детскими коллективами – важнейшее направление в системе музыкального воспитания / В. Крюкова // Музыкальная педагогика. – Ростов н/Д, 2009. – С. 209–218.

*14. Луб, В.* Методика обучения в самодеятельности трубачей и корнетистов / В. Луб. – М. : Музыка, 1982. – 80 с.

*15. Нежинский, О.* Детский духовой оркестр: метод. пособие для руководителей самодеятельных коллективов / О. Нежинский. – М. : ВНМЦ НТ и КПР, 1981. – 117 с.

*16. Нежинский, О.* Детский духовой оркестр / О. Нежинский. – М.: Музыка, 1989. – 128 с. : ноты. – (Худож. самодеят.).

*17. Толкачева, И.* Навыки чтения нот с листа / И. Толкачева // Музыкальная педагогика. – Ростов н/Д, 2009. – С. 266–272.

*18. Хаханян, Х. М.* Духовой оркестр / Х. М. Хаханян. – М. : Сов. Россия, 1974. – 112 с. – (Б-ка «В помощь худож. самодеят.». № 22).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. *Цуккерман, В. А.* Произведения для духового оркестра / В. А. Цуккерман // Очерки советского музыкального творчества ; ред. кол. Б. В. Асафьев, А. А. Альшванг, И. Ф. Бэлза [и др.]. – М. – Л., 1947. – Т. I. – С. 277–319.

20. *Щедрин, Б.* Некоторые вопросы музыкального языка концертных сочинений советских композиторов для духового оркестра 60–70 годов / Б. Щедрин // В помощь военному дирижеру. – М., 1975. – Вып. XVI. – С. 77–122.

21. *Щедрин, Б.* Новое в музыкальном языке произведений для духового оркестра / Б. Щедрин // В помощь военному дирижеру. – М., 1979. – Вып. XVIII. – С. 41–87.

*Дадатковая*

1. *Волков, В. В.* Репертуарно-методическое пособие для руководителей самодеятельных эстрадных оркестров и ансамблей / В. В. Волков. – Минск : РНМЦ НТ и КПР, 1985. – 99 с.

2. *Вилковир, Е.* Практический курс инструментовки для духового оркестра : учеб. пособие / Е. Вилковир ; ред. Д. Блюм. – М., 1963. – С. 18–47, 144–176, 244–272.

3. *Глинка, М.* Заметки об инструментовке / М. Глинка // Полн. собр. соч. – М., 1973. – Т. I. – С. 47–51.

4. *Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – С. 30–32, 48–51, 131–132, 181–212.

5. *Губнелова, Л.* Формирование тембрового слуха и развитие навыков оркестрового звучания у учащихся старших классов / Л. Губнелова // Музыкальная педагогика. – Ростов н/Д, 2009. – С. 146–157.

6. *Дунаев, Л.* Творческое наследие Н. П. Иванова-Радкевича – новый этап в развитии инструментовки для духового оркестра / Л. Дунаев // В помощь военному дирижеру. – М., 1974. – Вып. XIV. – С. 7–61.

7. Задачник по инструментовке / сост. Е. Макаров. – М., 1954. – Ч. IV. – С. 3–35.

8. *Зудин, Н.* Пособие по инструментовке для духового оркестра / Н. Зудин, Б. Кожевников. – М., 1950. – С. 3–6.

9. Инструментовка для духового оркестра : учеб. пособие / ред.-сост. Б. Т. Кожевников. – М., 1978. – С. 3–4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10.* Инструментовка музыкальных произведений для эстрадного инструментального состава типа «*Комбо*», духового и эстрадного оркестра: примерная программа и метод. указания / сост.: А. Л. Коротеев, С. Н. Янкович. – Минск, 1987. – С. 3–20.

*11. Карс, А.* История оркестровки : пер. с англ. / А. Карс. – М., 1989. – С. 168–186.

*12. Карацееў, А. Л.* Роля вытворчай і педагагічнай практыкі ў станаўленні спецыялістаў духавога мастацтва / А. Л. Карацееў // Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы : матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф. (1–2 лют. 2000 г.). – Мінск, 2000. – С. 84–90.

*13. Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси: жанрово-стилистические поиски и перспективы развития в XXI в. / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство на рубеже столетий: материалы Междунар. науч. конф. «Музыкальное творчество и XXI век: традиции, новации и перспективы» (г. Минск, 21 апр. 2000 г.) / сост. Р. И. Сергиенко. – Минск, 2000. – С. 41–45.

*14. Коротеев, А. Л.* Историко-художественная рефлексия жанрово-стилистических поисков композиторов (народно-инструментальное, ансамблевое и оркестровое исполнительство на духовых инструментах в Беларуси) / А. Л. Коротеев // Культура творчества: опыт, методология, рефлексия: материалы Междунар. науч. конф., посвящ. IV Междунар. дню философии, проводимому под эгидой ЮНЕСКО, г. Минск, 17–18 нояб. 2005 г. / Институт парламентаризма и предпринимательства, БИП – институт правоведения. – Минск, 2005. – С. 65–66.

*15. Коротеев, А. Л.* Перспективные направления подготовки кадров с целью эффективной реализации социокультурных функций духового искусства в условиях трансформирующейся экономики и формирующихся рыночных отношений / А. Л. Коротеев // Чалавек. Культура. Інфарматыка: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 7–8 снеж. 1999 г. / БелДІПК ; адк. рэд. і аўтар прадмовы Л. І. Ракавецкая. – Мінск, 2002. – С. 14–18.

*16. Коротеев, А. Л.* Совершенствование подготовки руководителей самодеятельных духовых и эстрадных оркестров на заочном отделении / А. Л. Коротеев // Совершенствование учебно-воспитательного процесса на заочных и вечерних отделениях институтов культуры : тезисы докладов и сообщений межвуз. науч.-практ. конф., 15–16 февр., Москва. – М., 1983. – С. 111.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Кузнецов, В.* Работа с самодеятельными эстрадными оркестрами и ансамблями / В. Г. Кузнецов. – М. : Музыка, 1981. – 131 с.

*18. Кузнецов, В.* Теория и методика учебно-творческого процесса в любительских эстрадных оркестрах и ансамблях / В. Г. Кузнецов. – М. : Музыка, 2000. – 246 с. : ноты.

*19. Некрасова, Г. В.* Камерная музыка для духовых инструментов с фортепиано (исторический обзор и некоторые вопросы интерпретации) / Г. В. Некрасова // Обучение и воспитание художественно одаренных детей и молодежи: проблемы психологии, педагогики, методики : материалы Междунар. науч. конф. «Музыкальное воспитание и образование» (9–12 янв. 2001 г., г. Минск). – Минск, 2001. – С. 104–116.

*20. Пистон, У.* Оркестровка : учеб. пособие / У. Пистон ; пер. с англ. К. Иванова. – М., 1990. – С. 112–296.

*21. Римский-Корсаков, Н.* Основы оркестровки / Н. Римский-Корсаков // Полн. собр. соч. – М., 1959. – Т. 3. – С. 37–38.

*22. Сагеев, Д.* Руководство по духова оркестрация / Д. Сагеев. – София, 1957. – С. 3–35.

*23. Чайковский, П. И.* Письмо к Н. Ф. фон Мекк / П. И. Чайковский // Полн. собр. соч. – М., 1962. – Т. 7. – С. 54–55.

*24. Suppan, Wolfgang.* Wind music research since 1966 / W. Suppan. A bibliography. – Tutzing, 2003. – 156 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі па вучэбнай дысцыпліне

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– састаўленне варыянтаў індывідуальнага плана работы выкладчыка навучальнай установы па правядзенні рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– састаўленне варыянтаў індывідуальных планаў і заданняў для ўдзельнікаў аматарскага аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў па засваенні выканальніцкіх навыкаў на духавых і ўдарных інструментах;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем»;

– франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па тэмах вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем».

## Патрабаванні па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Для ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтам з мэтай засваення неабходных ведаў вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» прапануюцца наступныя практычныя заняткі:

1) у працэсе выбару музычнага твора для адпаведнай рэпетыцыі вызначыць яго дакладны характар з мэтай размеркавання мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх сродкаў;

2) зрабіць музыказнаўчы і выканальніцкі аналіз вызначанага музычнага твора, скласці спіс мяркуемага адпаведнага музычна-інструментальнага арсенала з улікам неабходнай адаптацыі музычнага твора і вызначэннем аптымальнай танальнасці і тэсітуры гучання твора;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) напісаць характарыстыкі духавых інструментаў аркестра духавых і ўдарных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (лабіяльныя ці флейтавыя; ці язычковыя; амбушурныя ці муштучныя);

4) напісаць характарыстыкі ўдарных інструментаў аркестра духавых і ўдарных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (ідыяфоны; мембранафоны);

5) вызначыць інтэрвал транспазіцыі для інструментаў, якія транспануюць, з мэтай аператыўнай працы падчас рэпетыцыі з аркестрам духавых і ўдарных інструментаў;

6) скласці спіс асноўных тыпавых складаў ансамбляў духавых ці ўдарных інструментаў (аднайменныя, роднасныя, змешаныя) і напісаць характарыстыкі іх гучання;

7) адзначыць функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці ансамбляў духавых, ударных інструментаў, напісаць прыклады іх выкарыстання ў сучаснай айчыннай ці сусветнай выканальніцкай практыцы;

8) адзначыць функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, напісаць прыклады іх выкарыстання ў сучаснай айчыннай ці сусветнай выканальніцкай практыцы;

9) напісаць прыклады размеркавання галасоў у ансамблях духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з іх нотнаграфічным афармленнем;

10) напісаць прыклады размеркавання галасоў у аркестры духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з іх нотнаграфічным афармленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Выкарыстанне тэхнічных сродкаў

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» выкарыстоўваюцца наступныя матэрыялы:

1) музычныя фанаграмы з аўдыязапісамі гучання асобных духавых, ударных музычных інструментаў, розных складаў ансамбляў і аркестраў духавых, ударных музычных інструментаў;

2) музычныя фрагменты з запісамі гучання асобных духавых, ударных музычных інструментаў, розных складаў

ансамбляў і аркестраў духавых, ударных музычных інструментаў на CD (The Essential Steven Mead – Euphonium. QPRL 095D, 1998 Polyphonic Reproductions Ltd. 77-79 Dudden Hill Lane, London NW10 1BD, total time: 73,26; ORATION Steven Mead – Euphonium. QPRL 209D, Polyphonic Reproductions Ltd. PO Box 19292, London NW10 9WP, England, total time: 73,28;B medium, ODDCD42, C & R Warner / Chappell Music Norway 2000, total time: 71,38; Demo-CD Eine Broschure mit verkleinerten Direktions-stimmen informiert uber diese und weitere meiner Kompositionen und Bearbeitungen. Musikverlag Bruno Sulzbacher A-4582, total time: 78,58; CD. «Образцовый детский духовой оркестр Поречской детской музыкальной школы», 2006, агульнае гучанне 39,37);

3) відэафільм «Musik in Bewegung. Europas blaskapellen im Steirischen Schilcherland» (ORF-Steiermark, Marburgerstr. 20-8042 Graz. Sendug von 2. Juli 2000; агульнае гучанне 60 хвілін);

4) відэафільм «Фанфары Ялты». Международный фестиваль духовой музыки имени Василия Соколика». O-socolik.info;

5) DVD. Духовой квинтет «New life brass». 3 ноября 2012 года. Ереванская государственная консерватория им. Комитаса. Зал оперной студии им. Л. Сарьяна;

6) DVD. «Оркестр курсантов московской военной консерватории». «The Cadets orchestra of Moscow military conservatore». P&C 2010 «Капельмейстер». KOP 060/;

7) CD. Dutch civil Engineering band Wegenbouwkapel Nederland by Eurosound Studio's, Dijkstraat 5, 6674 AG Nerveld Holland;

8) CD. Music for Wageningen. Kapel van de Koninklijke Luchtmacht. 66.1030.72;

9) CD. Polskie tance narodowe. Orkiestra Deta OSP w Pruszcu – 2010. Dyrygent Miroslaw Kordowski;

10) CD. Концерт нижегородского губернского оркестра, посвященный юбилею директора и художественного руководителя Евгения Петрова. C 2016 ООО «СИТИ-САУНД»;

11) DVD. Телевизионный документальный фильм «Музыка для всех» (ТК «Волга» 2013, 25 ноября);

12) Polskie brzmienia. Dziela Grzegorza Duchnowskiego na orkiestre deta. ISBN 978-83-65559-11-1.

13) CD. Образцовый детский духовой оркестр Поречской детской музыкальной школы. Дирижер Валерий Сак. 2006 год;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14) CD. Minsk Brass Quintett. From Bach to Beatles Live. 1999. 001-061999-21261.

## Методыка навучання

Пры выкладанні матэрыялаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з аркестрам і ансамблем» выкарыстоўваюцца наступныя сучасныя педагагічныя тэхналогіі:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (творчыя паказы, майстар-класы і інш.);

– іграявыя тэхналогія (ролевыя, імітацыйныя ігры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА РАБОТЫ З АРКЕСТРАМ І АНСАМБЛЕМ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02*
*Народная творчасць (інструментальная музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная*
*музыка духавая*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,58. Ул.-выд. арк. 1,07. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ